УДК 821.161.3

***Н. М. Кунгер***

# МЕДЫТАТЫЎНАСЦЬ ПАЭЗІІ АНАТОЛЯ СЕРБАНТОВІЧА

*У артыкуле разглядаецца творчасць Анатоля Сербантовіча, раскрываецца эстэтыка-філасофскі і духоўны змест лірыкі паэта, падкрэслена, што паэзія – актыўны сродак унутранага самавыяўлення і мастацкага светапазнання.*

Спадчына Анатоля Сербантовіча застаецца глыбокай крыніцай пазнання чалавека. Мастак слова выразна ўсведамляе цяжкасць жыццёвых сцежак, лёсу Беларусі і папярэджвае будучыя пакаленні, што можа стацца з тым народам, які адрачэцца ад памяці продкаў.

Амаль кожны верш Анатоля Сербантовіча насычаны медытатыўнасцю, што лучыцца з глыбінным псіхалагізмам: і пейзажныя



МГПУ им. И.П.Шамякина

замалёўкі, і маналогі-споведзі, і лірыка кахання маюць абавязковы выхад з лакальнага перажывання і асабістага пачуцця на ўсеагульны драматызм і ўніверсальную трывогу як своеасаблівыя каталізатары дыялогавасці, шматгалосся. Дзякуючы падобнаму руху настрою і пафасу кожны твор паэта становіцца своеасаблівай драмай у вершах. Таму часта лірычны герой адчувае ці нават прадчувае сваё “выпадзенне” з часу, рух не ў нагу з ходам гістарычных падзей. У адпаведнасці з гэтым вынікае яшчэ адна сэнсавая дамінанта лірыкі А. Сербантовіча – у ёй пастаянна захоўваецца супрацьпастаўленне Дабра і Зла і вобразна-стылявы кантраст як асноўны прынцып пісьма. Жыццё асобы і нацыі падобна на вечны рух кола: Дабро процістаіць Злу, Бяда і Гора – Шчасцю, Галеча, Беднасць – Багаццю, Хвароба – Здароўю, Смерць – Жыццю. А разарваць гэты рух, часам механічны, можа толькі смерць, якая часта – адзіны паратунак, адзінае выйсце з цяжкага становішча.

Паэт выходзіць на прытчападобнасць як паказчык вострага адчування трагізму жыцця, прадчування катастрофы, напружанасці і нетрываласці чалавечага быцця. На раскрыццё гэтай ідэі працуе сімвалічны, а падчас і алегарычны прыём пісьма мастака слова, яго паэзія поўніцца шматлікімі вобразамі-сімваламі, некаторыя з якіх з’яўляюцца скразнымі: крыж – пакуты, сонца – свет, радасць, шчасце, абуджэнне пасля “змрочнага” сну, разбураная хата – цяжкая доля, адрачэнне аб сваіх каранёў, камень – крыўда. Анатоль Сербантовіч ідзе ў літаратуры шляхам канцэнтрацыі думак, пачуццяў, сэнсу ў творах, сінтэзу традыцыйнага і наватарскага, выяўлення на малой плошчы шматзначнага, яскравага, характэрнага. Адсюль і матыў “відушчасці-невідушчасці” ў творчасці А. Сербантовіча. Праблема мае не прыватны, а агульначалавечы, філасофскі характар. Гэта тлумачыцца многімі аб’ектыўнымі і – у большай ступені – суб’ектыўнымі фактарамі, сярод якіх ці не галоўны заключаецца ў паступовым празрэнні чалавецтва ў многіх накірунках яго дзейнасці. У сваю чаргу, працэс гэты надзвычай складаны, доўгі, эвалюцыйна-рэвалюцыйны. У ім удзельнічаюць часта неасвечаная маса і прарокі, відушчыя празарліўцы, дзякуючы якім і адбываецца паступовае далучэнне невідушчых да відушчых. У маральна-этычным плане праблема “відушчасць – невідушчасць” – гэта праблема свядомасці і несвядомасці, ведання і няведання, святла і цемры, маральнай адухоўленасці і духоўнага (усвядомленага ці неўсвядомленага) заняпаду. Яе значнасць абумоўлена заўсёдным жаданнем чалавецтва глыбей спазнаць сябе ў атачэнні прыроды як свядомую часцінку Сусвету. Паступова ўздымаючыся ад няведання з’яў да іх адноснага разумення, людзі рухаліся да сучаснай ступені цывілізацыі – навуковай, культурнай, літаратурна-эстэтычнай, разумення велічы сваёй місіі на Зямлі і ў Космасе. Падобны працэс і занатавала літаратура народаў свету і навучыла людзей быць “відушчымі”, успрымаць свой лёс як усвядомленую неабходнасць і, па магчымасці, кіраваць ім.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Адна з першых спроб распрацоўкі закранутай праблемы была зроблена яшчэ ў пачатку Нашага часу ў "Новым запавеце": Хрыстос – сын Бога – усё бачыць і ўсё чуе, а астатнія людзі – сляпыя, "невідушчыя" – не разумеюць сапраўднай сутнасці рэчаў, з'яўляюцца раўнадушнымі (у большасці сваёй) сведкамі ўкрыжавання "ўсебачнага" Прарока на Галгофе. Падобныя матывы можна знайсці не толькі ў хрысціянскім вучэнні, але і ў старадаўніх паганскіх звычаях нашых продкаў: заўсёды, у любы час знаходзіліся прарокі, якія вялі за сабой народ, бачылі свет па-свойму і таму імкнуліся выкарыстаць іншых ("невідушчых") у сваіх мэтах (іх называлі ўладарамі, вешчунамі, старэйшынамі). У агульным філасофскім плане "відушчасць" – Святло, Бог, Дабро, а "невідушчасць" – Цемра, Д'ябал, Ліха. Гістарычна дадзеная праблема залежыць ад супрацьстаяння Неба, Вышыні і Зямлі, Нізу. А раўнавагу паміж гэтымі супрацьлеглымі полюсамі ўсталяваць вельмі цяжка. Яна, гэтая раўнавага, залежыць ад таго, ці можа кожны чалавек выбіраць свой лёс, свой шлях, які прывядзе туды, куды марыць патрапіць, на першы погляд, і ён сам, і многія іншыя. "Відушчасць", у агульным плане, – гэта імкненне да дабра і святла, да разумення "сапраўднасці" абранага шляху і ў той жа час адказнасць за "невідушчых", якія могуць пайсці за табой; "невідушчасць" – цемра, цяжкі, пакутны сон, якога павінен пазбавіцца чалавек, каб пачаць жыццё па больш-менш прыстойных і гарманічных правілах.

Анатоль Сербантовіч таксама ўнёс значны ўклад у распрацоўку акрэсленай вышэй праблемы. Чаму адны людзі бачаць ("відушчыя"), а другія не бачаць ці не хочуць зразумець схаваную ад павярхоўнага зроку сутнасць справаў ("невідушчыя")? Аказваецца, усё даволі проста: мала хто можа адкрыта супрацьстаяць, як, напрыклад, Хрыстос, драматычным падзеям, абставінам, калізіям і парадоксам гісторыі. Так і чалавек у большасці сваёй падобны "пігмеям" з аднайменнага верша.

Пігмеі, як метэарыты,
Ля самых сонечных планет.
І іх пігмейскія арбіты
Праходзяць нават ля мяне.

Яны ўсміхнуцца нам умеюць,
Хоць іх заўсёды мучыць злосць,
Што на зямлі не ўсё пігмеі,
Што на зямлі і людзі ёсць.
Нічога ўгору не паднялі,
Людзям нічога не даюць.
Яны бяздарнасць гучна
хваляць,
А талент ціха аплююць.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Баюся тых, хто спрытна хлусіць,
Баюся я святош малых.
І сёння больш за ўсё баюся
Пігмейскай хітрай пахвалы [1, 46].

Людзі крычаць пустое “ўра”, спяшаюцца ў нейкую светлую будучыню, едуць на машынах у рай. І толькі адзін чалавек пратэстуе, ён, адзіны відушчы, ідзе ў бой.

Пустое “ўра”
нікога не парадуе.
Ідуць гады –
знікае ўяўны дым.
І рады я, што ўжо на праз параднае
Мы на жыццё сучаснае глядзім.

Тых,
хто не бачыць дрэннага праз добрае,
Ў прамовы лье салодкую ваду, –
Лічу як нашых самых злейшых ворагаў
І першы ў бой бязлітасна
іду [1, 32].

Гэты твор працягвае ідэю пошукаў народам сябе, напамінак, што чалавек, нягледзячы на свой востры зрок, падчас не бачыць, куды вядзе яго шлях цывілізацыі, заснаваный на разбурэнні і знішчэнні прыроды і чалавечага ў чалавеку.

Так, Анатоль Сербантовіч заклікаў людзей паверыць у свае магчымасці, ісці да канца ў пошуках высокага сэнсу існавання ў вялікім часе не толькі для сябе, але і для іншых, дзеля дасягнення вечных каштоўнасцей.

Як відаць з гэтых твораў, у паэзіі А. Сербантовіча паяднаны стройнасць вобразнай сістэмы, цэласнасць асноўнай думкі. Душа лірычнага героя востра рэагуе на няўдачы. Вершы, прысвечаныя пераменам, якія адбываюцца ў душы лірычнага героя, напоўненыя значным філасофскім зместам. Прастора і час у медытатыўнай лірыцы паэта часцей за ўсё нестабільныя: першая то звужваецца, то пашыраецца, другі то фіксуецца ў кропку, то выплёскваецца ў Космас, і таму яна нагадвае мастацкую мадэль свету, заснаваную на пастаноўцы складаных і дыялектычных пытанняў пра Дабро і Зло.

Анатоль Сербантовіч – асоба, закранутая вайной. Вершы ваеннай тэматыкі атрымалі ў яго творчасці не толькі выразнае адычнае гучанне, высокую пафаснасць, але і адрозніваюцца трагедыйнасцю, што ўзнікае

МГПУ им. И.П.Шамякина

праз супастаўленне ваеннага і мірнага жыцця, праз адмаўленне аднаго і ўхваленне другога (“Асколкі”, “Міннае поле”, “Салдат” і інш.). У творах, прысвечаных вайне, аўтар фатаграфуе не толькі пэўныя падзеі, але і глыбока разважае пра лёс асобнага чалавека і грамадства ў цэлым, пра нечалавечую жорсткасць і знішчэнне дабрыні. Гэта часцей за ўсё паэтычныя заклікі да людзей, каб яны памяталі свае першавытокі і захоўвалі чалавечы воблік нават у пагранічных сітуацыях, у якіх апошні радок набывае сэнсавую нагрузку, з’яўляецца дамінантай, якой падначалены ўсе сімвалы і тропы верша.

Помніцца,
як хлапчукамі рана
Ў нейкую далёкую вясну
Пра вайну чыталі мы раманы
І гулялі толькі у вайну.

Вані, Сашы – кожны быў, як сокал,
Сокал той, што у зямлі ў гасцях.
Галаву у “бой” няслі высока,
Так, як на флагштоку сцяг.

Камандзіраў строга выбіралі.
Бралі ў рукі палкі – па каню.
Маці хусткай вочы выціралі,
Гледзячы на гэтую гульню.

Хто з нас ран не патрывожыў змалку,
Ран, што ім пакінула вайна,
Тым, што ў час ён не стрыножыў
палку –
Вернага маленству скакуна?! [1, 286].

Творы і ўспрымаюцца як фрагменты біяграфіі не толькі адной душы – душы паэта – і амаль тоеснай ёй душы лірычнага героя, але і ўсяго беларускага народа, нават шырэй – славянскай душы, якая знаходзіць апору ў адзінстве ўсяго чалавецтва і прыроды, Космаса. Паэтычная творчасць Анатоля Сербантовіча вызначаецца стылявой і жанравай разнастайнасцю, спалучае ў сабе рэалістычны і рамантычны пачаткі.

У наш час склалася такая сітуацыя, што ў творчасці асобных пісьменнікаў, прадстаўнікоў розных стылявых напрамкаў спалучаюцца розныя жанравыя адзнакі, а ў лірыцы часта сціраюцца адрозненні паміж жанрамі. Нават у межах аднаго верша часам выяўляецца рух сучаснай беларускай літаратуры да сінтэзу.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Але на пустым месцы нішто не з’явіцца, таму жанравае развіццё сучаснай літаратуры – сведчанне выкарыстання мастакамі вопыту папярэдняй эпохі, творчых набыткаў многіх майстроў і яго ўдасканалення. Найбольш пашыранымі традыцыйнымі жанрамі і жанравымі формамі ў паэзіі Анатоля Сербантовіча з’яўляюцца балада, элегія, санет.

Таму ўзнікае неабходнасць – прыадчыніць адну з таямніц вобразнага мыслення Анатоля Сербантовіча, паказаць адметнасць яго санетыстыкі. “Санет – від верша, які складаецца з пяці-, радзей чатырох- ці шасцістопнага ямба. Аб’ядноўвае два чатырохрадкоўі і два трохрадкоўі. Дзве рыфмы спалучаюць катрэны (абба абба ці абаб абаб), тры рыфмы тэрцэтаў размяшчаюцца ў залежнасці ад характару папярэдняй рыфмоўкі [ввг дгд ці ввг ддг). Такая будова санета не выпадковая, яна цесна звязана з разгортваннем зместу: у катрэнах змяшчаецца своеасаблівая экспазіцыя і разгортваецца тэма, а ў тэрцэтах падаецца яе кульмінацыя і развязка” [2, 511]. Пашырэнне тэматычнага зместу санетыстыкі патрабавала больш глыбокай распрацоўкі тэм, што немагчыма было здзейсніць з-за рамкавай абмежаванасці санетнай формы, яе невялікага аб’ёму. Менавіта патрабаваннем пашырэння змястоўнасці ў межах традыцыйнай формы была выклікана да жыцця больш складаная кампазіцыйная вершаваная структура – вянок санетаў. Гэта аб’яднанне пятнаццаці санетаў у адно змястоўнае кампазіцыйнае цэлае, з агульнай назвай, метрычнай, рытмічнай, інтанацыйна-сінтаксічнай будовай радка і спецыфічнай санетнай рыфмоўкай. Адмысловасць вянка санетаў заключаецца ў тым, што ў сваім кананічным выглядзе гэта пятнаццаць санетаў, дзе першыя чатырнаццаць звязаны ў своеасаблівае кольца (вянок), таму што апошні радок кожнага санета (санетны замок) паўтараецца ў першым радку наступнага, а апошні радок чатырнаццатага санета паўтарае першы радок першага санета. Пятнаццаты санет называецца магістралам і цалкам складаецца з першых радкоў папярэдніх чатырнаццаці санетаў, што надае цэласнасць і знітаванасць усяму твору.

Значным дасягненнем Анатоля Сербантовіча ў санетатворчасці з’яўляецца яго вянок санетаў “Курганы” – вельмі цяжкая цыклічная форма, якая патрабуе ад паэта велізарнай вынаходлівасці і майстэрства, дасканалага валодання словам, рытмікай, сістэмай рыфмоўкі і законамі вершаскладання.

У сваім вянку санетаў паэт узняў чалавечую памяць на высокі п’едэстал гонару.

Цыкл санетаў “Курганы” ўяўляе сабою не проста падбор санетаў, створаных паэтам і аб’яднаных агульнай тэмай, а адлюстроўвае яго задуму паказаць памяць у руху.

Завяршае свой вянок санетаў Анатоль Сербантовіч магістралам. Пішацца ён раней за іншыя санеты, але паколькі стаіць пасля іх, то ствараецца ўражанне яго раптоўнага і ненаўмыснага самаўзнікнення.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Магістрал вызначае ідэйную задуму ўсяго вянка санетаў, таму павінен быць выразным па выказанай думцы, дасканалым па форме:

У курганоў ёсць нешта ад званоў,
Званоў жалобы і званоў бяды,
Яны гудуць цяжэй, чым правады,
І аб усім напамінаюць зноў.

Наколькі помню – ўсе мае гады –
Тых, хто згубіў унукаў і сыноў,
Прыводзілі да вечных курганоў
Зарой пафарбаваныя сляды [1, 223].

Створаны Анатолем Сербантовічам вянок санетаў "Курганы" з'яўляецца ўдалай спробай паэта адрадзіць, удасканаліць магчымасці паэзіі, якая не абмяжоўваецца нарматыўнымі і фармальнымі законамі, дасягнуць новых вышынь адлюстравання рэчаіснасці ў межах цвёрдых жанравых формаў санетаў.

Санетысты спрадвеку апявалі каханне, апісвалі складаныя духоўныя перажыванні, і толькі некаторыя паэты ў сваёй творчасці змаглі ў складанай форме ўвасобіць філасофска-медытатыўны змест.

Анатоль Сербантовіч пераадолеў даўнія традыцыі, на якія абапіраліся майстры вянкоў санетаў як мастацкай цэласнасці, надаў новае дыханне, здавалася б, непарушнаму на працягу дзесяцігоддзяў жанру. Рамантыкі ад прыроды, беларускія санетысты нібы нязмушана, без намаганняў надаюць вершам эмацыянальнае гучанне, але пры гэтым скіроўваюць кожную страфу санета ў зададзенае жанрам рэчышча глыбокай змястоўнасці, афарыстычнасці і медытатыўнасці.

Маўклівае трывожнае зацішша.
– О першы і апошні мой санет,
Скажы мне, што пра нас напіша
Сапраўдны, не такі, як мы, паэт?

– Пісалі вы пра яблыкі і вішні,
І нават кожны куст лясны апет.
Паэт – яшчэ нікольні не паэт,
Калі, як Данка, да людзей не выйшаў.
Даволі росы ў травы абтрасаць,
Дарогі трэба сэрцам асвятляць.
Нам новыя відны ўжо далячыні.
І калі будзеш ты, паэт, такім,
То лягуць верша шчырыя радкі
Айчыне на чало, нібы маршчыны [1, 333].

МГПУ им. И.П.Шамякина

У філасофскім падыходзе да жыцця, у медытацыях паэта доля рацыяналістычнага моцна пацясніла эмацыянальны пачатак, аднак у лепшых сваіх творах паэт змог дасягнуць гарманічнай раўнавагі і сінтэзу роздуму і болю перажытага.

Літаратура

1. Сербантовіч, А. Жаваранак у зеніце: вершы / А. Сербантовіч. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 478 с.

2. Рагойша, В. Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 576 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина